В.Ю. Бароўка

# У пошуках аптымальнай метадалогіі

Так можна вызначыць мэту VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Сучасная герменеўтыка і інтэрпрэтацыя мастацкага тэксту (лінгвістычны, літаратуразнаўчы і дыдактычны аспекты)», якая праходзіла 22–24 красавіка 2004 года ў Вільнюсе. Арганізатарамі навуковага форума сталі Вільнюскі педагагічны універсітэт, Люблінскі універсітэт імя М. Кюры-Складоўскай і Даўгаўпілскі універсітэт. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел каля 70 навукоўцаў з розных еўрапейскіх краін (Беларусі, Латвіі, Літвы, Расіі, Чэхіі), самым шматлікім было прадстаўніцтва арганізатараў – Вільнюскага педагагічнага універсітэта і Даўгаўпілскага універсітэта. З беларускіх ВНУ на канферэнцыі прысутнічалі навукоўцы з Віцебска, Гомеля і Мінска.

Удзел у канферэнцыі даў магчымасць пазнаёміцца з найбольш запатрабаванай у сучаснай філалогіі метадалогіяй навуковых даследаванняў. Так, латвійскія вучоныя абапіраліся на прынцыпы структуралізму і кампаратывізму, нямецкія – на фенаменалагізм, польскія – на фенаменалагізм, псіхааналітызм, ідэі рэцэптыўнай крытыкі і дэканструктывізму, чэшскія – на кампаратывізм у спалучэнні з фенаменалагізмам, беларускія – на ідэі псіхалагічнай школы, сацыялагізм і структуралізм, літоўскія – на герменеўтыку. Дарэчы, канферэнцыя праходзіла падчас падрыхтоўкі нашымі калегамі з Літвы матэрыялаў для дзяржаўных выпускных экзаменаў. Па словах выкладчыкаў Вільнюскага педагагічнага універсітэта, іх студэнты здаюць выпускны экзамен па літаратуры шляхам аналізу мастацкага тэксту, у працэсе якога неабходна паказаць спецыфіку эпохі, адметнасць аўтарскага стылю і адметнасць канкрэтнага мастацкага твора.

Канферэнцыя доўжылася тры дні, у першы дзень былі заслуханы даклады на пленарным пасяджэнні такіх аўтарытэтных літаратуразнаўцаў, як Ф. Фёдараў, Ю. Новікас, І. Трафімаў, В. Кавальчык, у наступныя два дні ўдзельнікі працавалі ў трох секцыях «Інтэрпрэтацыя і рэінтэрпрэтацыя тэксту ў свеце праблемы «Я» і «Іншы», «Інтэрпрэтацыя і сэнс: аўтар – твор – чытач», «Мастацкі тэкст – настаўнік – вучань (дыдактычныя аспекты)». Варта падкрэсліць, што даклады дэталёва абмяркоўваліся. Абмеркаванне дакладаў яшчэ раз даказала, што выбар метадалогіі залежыць не толькі ад моды, пануючых традыцый, а найперш ад асаблівасцей «эстэтычнага аб'екта». На пасяджэнне секцыі «Мастацкі тэкст – настаўнік – вучань (дыдактычныя аспекты)» арганізатары запрасілі прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі Літвы для таго, каб не разыходзіліся тэорыя з практыкай.

Лічу, што ўдзел у сур'ёзных навуковых канферэнцыях – адна з формаў павышэння навуковага ўзроўню выкладчыка ВНУ, бо дазваляе пазнаёміцца з шырокім спектрам тэарэтычных і метадалагічных напрацовак калег з розных краін свету.